

ШЛЯХ ЦМОКА

Вераніка ШЫДЛОЎСКАЯ
Фота аўтара,
Дзяніса ІЎКОВІЧА,
sb.by

Кажуць, у глыбіні беларускіх лясоў, сярод багны і блакітных азёр да гэтага часу жыве Цмок. Не пачвара са страшылак, а мудры захавальнік вод. Ён не хавае скарбы ў пячорах, яго багацце - балоты, лясы і рэкі, якія стагоддзямі кармілі і абаранялі чалавека. І дзе, калі не ў запаведным лесе, атрымаецца ўз'яднацца са сваімі каранямі, адчуць жывую сувязь з продкамі і прыродай? Менавіта з гэтай мэтай у Бярэзінскім біясферным запаведніку ўжо сёмы год праводзяць Міжнародны фестываль славянскай міфалогіі «Шлях Цмока».

Пляцоўка для мерапрыемства абрана не выпадкова. Бярэзінскі біясферны запаведнік – тэрыторыя з вышэйшым прыродаахоўным статусам. Тут дзейнічае строгі рэжым аховы рэдкіх відаў жывёл, буйных балот і лясоў у першародным выглядзе. У гэтых мясцінах жыве дзіўная фаўна, многія прадстаўнікі якой занесены ў Чырвоную кнігу. Тут можна сустрэць велічнага зубра, у глухіх кутках хаваецца буры мядзведзь – каля 75 асобін. Еўрапейская норка, таемная і асцярожная, знаходзіць прытулак каля чыстых вадаёмаў, а ў нетрах лесу ўладкоўвае гнёзды чорны бусел.

Над абшарамі лётае арлан-белахвост, які з'яўляецца адным з найбуйнейшых арлоў, чыя папуляцыя патрабуе пастаяннай аховы.

Але справа не толькі ў фаўне – запаведнік з’яўляецца месцам сілы. Ён знаходзіцца ў вярхоўях ракі Бярэзіны, якая нясе свае воды па яго тэрыторыі на працягу амаль 100 км. Больш за 80 рэчак і раўчукоў, якія вынікаюць з запаведных лясоў і балот, сілкуюць гэту буйную водную артэрыю. Рэчышча ракі звілістае, з незлічонымі паваротамі і ціхімі затокамі.

Тут знаходзіцца каля 20 азёр, у тым ліку такія вялікія, як Палік, Альшыца, Плаўна, больш за палову тэрыторыі займаюць балоты, злучаныя разгалінаванай сеткай малых лясных раўчукоў і рэчак.

А яшчэ ў запаведніку захаваліся рэшткі Бярэзінскай воднай сістэмы, грандыёзнага гідратэхнічнага праекта канца XVIII ст., які калісьці звязваў два моры – тут пралягаў водападзел паміж басейнамі Балтыйскага і Чорнага мораў. Сёння шумная ў мінулым транспартная артэрыя ператварылася ў ціхі куток, дзе гаспадараць бабры і выдры, а старажытныя каналы сталі папулярным маршрутам для турыстаў.

Менавіта таму прырода Бярэзінскага запаведніка не дэкаратыўны фон, а сэрца любой падзеі – ад навуковага сімпозіума да фестывалю. Першародныя абшары і іх незвычайныя насельнікі задаюць тон і атмасферу.

Дух месца

У адрозненне ад замежных драконаў, якія жывуць у пячорах, беларускі непарыўна звязаны з мясцовым ландшафтам. Яго вобраз натуральна «вырастае» з прыроды Беларусі, якую па праве можна назваць краінай азёр, балот і лясоў. Радзімай Цмока, паводле паданняў, лічыцца Лепельскае возера, бо менавіта тут ён жыў, а мясцовыя жыхары прасілі ў яго дабраславення пад час вяселляў.

У 2013 г. на беразе возера нават з’явілася скульптура беларускага дракона, зробленная па апісанні пачвары ў рамане Уладзіміра Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні»: «Выглядам той цмок быў, як звер фока (цюлень), такі самы льсняны, у складках, толькі без поўсці. І шэры, як фока. Але даўжэйшы за яго куцы. Бо даўжыні ў ім было сем з паловай лагожаскіх (лагойскіх) сажняў, а калі пацікавіцца немец, то восем і адна пятая фадэна, а калі, можа, англец, то сорак дзевяць футаў і яшчэ дваццаць два дзюймы. Тулава мелі тыя цмокі шырокае і трохі пляскастае, і мелі яны плаўнікі – не такія, як у рыбы, а такія таксама, як у фокі, таўстамясыя, шырокія, але не дужа доўгія...».

Аднак галоўнае ў вобразе Цмока – яго функцыя духаахоўніка, які стаіць на варце прыроднага балансу. Яго забойства, згодна павер'яў, выклікала масавыя паводкі. Як і ў выпадку з іншымі духамі, напрыклад лешым, які караў за нявартыя паводзіны ў лесе, легенды пра Цмока выконвалі важную экалагічную функцыю.

Менеджар па турызме Бярэзінскага біясфернага запаведніка **Дыяна ПРАКОШЫНА** звяртае ўвагу, што гапоўная ідэя фестывапю – адраджэнне і папулярызацыя беларускай міфалогіі як унікальнай культурнай спадчыны нашай краіны: «Старажытныя міфы беларусаў – гэта не проста казкі, гэта глыбокая філасофія, якая вучыць ча–лавека жыць у гармоніі з прыродай. Па сутнасці, нашы продкі праз легенды стварылі першую форму аховы навакольнага асяроддзя. Разумение простае: пакуль мы беражэм прыроду, працягваецца жыццё».



Адзін з брэндаў Бярэзінскага запаведніка - дух-ахоўнік тутэйшых балотных мясцін Балотнік Незвычайны

Фестываль як магчымасць



«Шлях Цмока» – запрашэнне набыць сувязь з прыродай праз вяртанне да сваіх каранёў. Усё – ад музыкі да народных рамеснікаў – акунае ў той перыяд, калі людзі жылі ў гармоніі з лесам.

Галоўная лакацыя – імерсіўная экасцежка «У краі міфаў». Днём яна працуе як музей, дзе славянскія легенды ажываюць пад адкрытым небам. На маршруце ўстаноўлены рэалістычныя арт–аб'екты і інсталяцыі персанажаў беларускай і славянскай міфалогіі (Балотніка, Цмока, Лесавіка і інш.). Але, калі сонца садзіцца, сцежка змяняецца.



– Мы адышлі ад сумнага пераказу легенд да інтэрактыўнага фармату. Так, падчас начной імерсіўнай экскурсіі па экасцежцы «У краі міфаў» сціраецца грань паміж гледачом і казкай: госці акунаюцца ў таямнічую атмасферу змрочнага лесу і становяцца паўнавартаснымі ўдзельнікамі старажытных абрадаў, што прыводзіць у захапленне любога турыста, – расказала Дыяна Пракошына.

Але фестываль не абмяжоўваецца шпацырам па сцежцы.

З усёй Беларусі сюды з'язджаюцца рамеснікі, каб паказаць, як у кожным вырабе векавыя традыцыі пераплятаюцца з прыродай. Тут можна ўбачыць, як ствараюцца ўпрыгожванні і фігуркі з розных матэрыялаў, куюцца маленькія і ў чалавечы рост скульптуры. Для гасцей арганізаваны майстар–класы: можна паспрабаваць сябе ў якасці смелага рыцара, траўніцы, лучніка – кожны знойдзе штосьці для душы. Дарэчы, на тэрыторыі дзейнічала зона шлюбу, дзе закаханыя маглі пажаніцца.

Яшчэ адна візітная картка фэстывалю – конкурс касцюмаў. Кожны год з розных куткоў краіны прыязджаюць Цмокі, Лешыя, Русапкі, Чарнабог і іншыя чароўныя істоты, каб пазмагацца ў фантазіі. Сёлета ў вобразах міфічных персанажаў выступілі 48 удзельнікаў – як дзяцей, так і дарослых – з Мінска, Віцебска, Гродна, Магілёва і іншых гарадоў.

Так, Галіна і Міхаіл Сцепаненкі, сямейная пара з Віцебска, – ужо вопытныя ўдзельнікі гэтага конкурсу. Міхаіл, які летась стаў сярэбраным прызёрам за вобраз Лешага, сёлета вырашыў стаць перад журы ў якасці Чарнабога – персанажа, які ўвасабляе цемру. Яго касцюм з масіўнымі крыламі і рагамі адначасова палохае і ўражвае. Галіна ж абрала вобраз Вужалкі, дачкі Вужынага Караля, – прывабнай жанчыны з трохметровым змяіным хвастом. Стварэнне яе касцюма патрабавала неверагоднага цярпення: кожную лускавінку Галіна выразала і мацавала сама.

– Кожны год фестывапь мяняецца пад запыты нашых гасцей і ўнутранае развіццё запаведніка. З-за наплыву наведвальнікаў у 2025 г. «Шлях Цмока» пераехаў з цэнтральнай сядзібы ў Домжарыцах на прасторнае поле каля ляснога заапарка, ператварыўшыся ў маштабны *open–air.* У гэтым сезоне мы дэталёва прааналізавалі водгукі гасцей з мінулых гадоў і кардынальна перапрацавапі занаваннe тэрыторыі і праграму. Кемпінг–зона і аўтастаянка стала бліжэй, а сцэна і ўсе актыўнасці размясціліся на адным полі. У выніку госці атрымалі паўнавартасны двухдзённы марафон жывой музыкі, інтэрактыўных лакацый і актыўнасцей, дзе кожны метр прасторы дыхаў атмасферай міфаў, – адзначыла Дыяна Пракошына.

Экалагічная адказнасць

Бярэзінскі біясферны запаведнік – адна з самых экалагічна чыстых тэрыторый краіны. Правядзенне масавага мерапрыемства тут накладвае асаблівую адказнасць.

– Чысціня на тэрыторыі фэсту – наш безумоўны прыярытэт. У дні мерапрыемства працуе зладжаная экакаманда, якая складаецца з супрацоўнікаў запаведніка. Лагістыку абыходжання з адходамі мы прадумалі да дробязей: па ўсёй тэрыторыі былі ўстаноўлены спецыяльныя кантэйнеры. Па меры запаўнення яны спусташаліся, а камунальныя службы аператыўна вывозілі смецце.

Дзякуючы гэтаму нам удалося захаваць месца ў першароднай чысціні – ад святкавання тут не засталося і следу, – з гонарам падкрэсліла Дыяна Пракошына.

Легенда пра Цмока – тэта не проста казачная гісторыя. Яна адлюстроўвае глыбокую павагу нашых продкаў да навакольнага свету. А дзе, калі не ў запаведнай зоне, ідэальнае месца, каб нагадаць: прырода – не фон, а галоўны герой нашай гісторыі.

Чарнабог - вобраз жыхара Віцебска Міхаіла Сцепаненкі - стаў пераможцай конкурсу касцюмаў «Шляха Цмока» - 2026.

